**«ДЗЯ́ДЗЬКА АНТО́Н»**, перакладны твор бел. л-ры 19 ст.; агітацыйная брашура. Першая спроба выдання датуецца 1887. Пад назвай «Старая прысказка» выдадзена К.Гучкоўскім у Львове, але ўвесь наклад быў канфіскаваны паліцыяй. Упершыню на бел. мове апубл. М.Абрамовічам у 1892 у г.Тыльзіт (Германія, цяпер г. Савецк Калінінградскай вобл., Расія) пад назвай «Дзядзька Антон, або Гутарка аб усім чыста, што баліць, а чаму баліць — не ведаем». У 1903 выдадзена ў Лондане пад назвай «Куды мужыцкія грошы ідуць». Пераклады зроблены з розных рэдакцый польскамоўнай брашуры «Бацька Шыман». Змест твора блізкі да кніг украінца С.А.Падалінскага «Пра багацце і беднасць» і рус. публіцыста А.І.Іванова «Хітрая механіка». У цэнтры ўвагі — былы віленскі настаўнік Антон. Седзячы ў карчме, ён называе прычыны беднасці сялян: сац. няроўнасць і вялізныя падаткі. Мужык — крыніца ўсіх багаццяў дзяржавы — эканамічна неабаронены. Вуснамі дзядзькі Антона прысутны ў тэксце распавядальнік даводзіць тое, што адзіным выйсцем для бел. мужыка можа быць узброенае паўстанне. Аўтарства твора доўгі час памылкова прыпісвалася А.Гурыновічу.

*В.І.Еўмянькоў.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова